
Самапомач — Самаромаў
Беларуская кооператыўна-гаспадарчая часопіс

Год V.	Вільня, Студзень-Люты 1936 г.	№ 1-2.


Хай злыдні над намі,
скрыпючуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаны дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомачу.

Джордж РЭССЭЛЬ (Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 1-2 (42-43).

Ceny ŭ Vilni

26.II.36. Ceny za 100 kilohram.

Zbožža.

(Pry kupli—prodažy)

Žyta, II sort	12.15—12 20
Pšanica II sort	19.50
Muka pšaničnaja	21.50 - 32 00

(Ceny z papiarednich dzion).

Žyta	12.00—12 50
Pšanica	19.50 – 21.00
Jačmień na pansak	12.50—13 75
Avios	12.50—13.50
Hračycha	13.50—14 00
Muka žytniaja da 45%	22.00 – 22.25
Muka žytniaja da 55%	19.50 – 20 00
Muka žytniaja da 90%	15.00—15 50
Votruby pšaničnyja	10.50—11 00
Votruby žytnija	9 25 – 9.50
Pialuška	21.75—22.25
Vika	20.00—20.50
Seradela	22.00—22 50
Haroch šery	13.75 14 25
Łubin sini	9 50—10.00
Siemia lannoje b.90%	32 75—33.25
Lon (vałakno) standaryzawany (za 1000 kilo)	
„ trapany, Vałožyn	1300—1340
„ „ Miory	1300—1340
„ časany Harodziej	1860 - 1900
Kudziela Harodziejskaja	1330—1370
Makuchi lannyja (za 100 kilo)	17.00
„ sonečnikawyja	16.00
„ repakowyja	13.00

Małočnaje za 1 kilo (28.II 36.)

Masła najlepšaje, I. sort za kil. ŭ hur.	2 80—2 90
„ „ „ „ „ u detalu	—3.20
Masła stałovaje II sort za kilo ŭ hurcie	2.65—2.75
„ „ „ „ „ u detalu	—3.00
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.50—2 20
„ „ „ „ u detalu	1.80—2.60
Syr ementalski(švajc.)za kilo ŭ hurcie	2.55—2.65
„ „ „ „ „ u detalu	—3.20
Jajki, kopa	4.20—5.40
„ za štuku	8—10 hraš.

(Dalejšy ciah cenaŭ na 3 bačynie vokładki).

Samapomač

BIEŁARUSKI
KOOPERATYŪNA - HASPADARSKI
ČASAPIS.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 9—4.

Самапомач

Hod V.	Vilnia, Studzień-Luty 1936 h.	Nr. 1-2 (42-43).

Jak jość i jak pavinna być

(*Zamiest Novahodniaha*)

Paśla taho, jak 13 sakavika 1934 hodu byŭ źmienieny polski zakon ab kooperatyvach, jaki ŭ praciahu minułaha 1935 hodu staŭ poŭnaściu abaviazvać i na ŭsich zach.-biełaruskich ziemlach, kožnamu było jasna, što volnaj kooperacyi — takoj jak jaje razumieli pieršyja zakładčyki z Ročdelu (u Anhlii) — pryjšoŭ kaniec. Hetak my spravu razumiejem da siahońnia i tak jaje budziem razumieć datul, pakul nazvany zakon budzie abaviazvać. — Heta teoryja. A praktyka?

Na padstavie piśmaŭ z našych sioł i miastečak, a tak-ža z biespasiaredniaj sutyčnaści z žyćciom, viedajem, što ŭ minułym 1935 hodzie ŭzrost kooperatyŭnaha žyćcia na našych ziemlach byŭ nadzvyčajna silny dy što hety ŭzrost dalej mahutnieje, raźvivajecca.

Hetkaja sapraŭdnaść na pieršy pahlad byccam piareča ŭsiamu tamu, što raniej było skazana ab mahčymaściach raźvićcia ŭ nas kooperacyi. Ale heta tolki tak zdajecca: sapraŭdnaść nia tolki hetamu nie piareča, ale naadvarot, — paćvierdžaje. Uzrost kooperatyŭnaha žyćcia na našych ziemlach byŭ-by siahońnia biez paraŭnańnia silniejšym p ŭniejšym, kali-b jaho nie viazali normy vyšmienavanaha zakonu. Tyja-ž kooperatyvy, što mima ŭsich trudnaściaŭ usio-ž sarhanizavalisia i pracujuć, heta dokaz prabudžanaj śviedamaści ludziej, jakija zrazumieli. što biazdziejna čakać dalej nia možna, ale treba pamahać **samym sabie**. I my majem poŭnaje prava z hetaha ciešycca; tymbolš što ŭ prabudžeńni našaha narodu da samapomačnaj dziejnaści nia mała pryłažyli pracy i my praz našu „Samapomač" i praz našych dziejnych supracoŭnikaŭ, padpiščykaŭ i čytačoŭ. Na hetym miescy im za heta dziakujem i zaklikajem da pracy dalejšaj.

Jakaja-ž heta maje być praca?

Prabudžeńnie ludziej da śviedamaj samapomačnaj dziejnaści — vialikaja reč. Ale heta tolki pačatki. Bo j jakaja z taho karyść, što ludzi našy zamiest jak dahetul paadzinočku, ad siahońnia naprykład buduć całymi hramadami słužyć dla čužoha imia, dla čužoha dabra i na čužy kišeń? Jakaja z taho karyść, kali ludzi našy zamiest dalej žyć u niaśviedamaj biaz-dziejnaści, stanucca ad siahońnia niaśviedamym mataryjałam u rukach čužych ludziej, dla katorych u hałavie nie dabro našaha narodu, a niešta zusim inšaje?.. što z taho, kali zaaščadžanyja supolnaj pracaj załatoŭki pojduć i dalej — jak išli dahetul paasobnyja hrašy — „na krzewienie polskości na kresach", na aeraplany („Społem!") i fabryki, jakija choć i za našy hrošy budujucca, našymi nikoli nia byli i nia buduć, a jakija robiacca tolki dziela čužoha nam pierad zahranicaj samapachvalańnia? Abo ŭreście što i z taho, kali hetyja-ž supolna zaaščadžanyja załatoŭki jduć na ŭspamohu čužoj nam kultury, a svaje rodnyja paletki kultury stajać paparam? Kali napr. takija choćby ŭkrainskija sialanie ŭ Uschodniaj Haliččynie naležać da svaich rodnych ukrainskich kooperatyvaŭ, dyk hetyja kooperatyvy z nadvyžak svaje haspadarskaje dziejnaści ničoha nie adsyłajuć niekamu čužomu—jak heta dziejecca ŭ nas, ale apłačvajuć z ich supolna z inšymi susiednimi kooperatyvami — dla vyhody svaich arhanizavanych siabroŭ—akružnych ahranomaŭ, hadaŭlanych technikaŭ, veterynaraŭ, z čaho majuć u haspadarcy vačavidnuju karyść. A chto-ž nieśta padobnaje nia to što bačyŭ, ale prynamsia čuŭ ab kooperatyvach na ziemlach biełaruskich? Hetaha tut niama, bo ŭsio jdzie tut na roznyja składki ŭ čužyja sajuzy, tavarystvy i h. d. Čamu hetak dziejecca? A tamu, što ŭ Upravach (zažond) i Nahladnych Radach (rada nad zorča) našych kooperatyvaŭ niama dosyć śvietłych i śviedamych miascovych ludziej-Biełarusaŭ, katoryja, razumiejučy naša žyćcio, mahli-b u kooperatyvie haspadaryć tak, jak hetaha vymahaje žyvy interas vializnaj bolšaści sarhanizavanych biełaruskich siabroŭ. I pakul hetaha nia budzie, datul „našyja" kooperatyvy nia bu-

AD VYDAVIECTVA.

Hety padvojny numar „Samapomačy" vychodzić u śviet z značnym spaźnieńniem, vyklikanym inšymi nieadkładnymi zaniaćciami redakcyjnaha personału pry pačatku Novaha hodu, a tak-ža pieraškodami charaktaru mataryjalnaha. Rehularnaje vydavańnie dalšych numaroŭ „Samapomačy" zaleža i ad akuratnaści čytačoŭ u prysyłańni składak na časapis. Dyk kožny ŭ svaim kruzie znajomych i susiedziaŭ chaj pastarajecca sabrać jak najbolš stałych čyčačoŭ (najlepš „dziesiatkami") „Samapomačy".

duć zapraŭdy našymi, ale tolki čužymi. — Dyk jak-ža tady być?

Vychad na heta jošć. U pracy haspadarča-kooperatyŭnaj treba vykarystać došled zdabyty ŭ pracy kulturna-aśvietnaj. Byŭ čas, kali z biełaruskim słovam nia možna było pakazacca ŭ roznyja „koły“ polskich u nas „stovažyšeńniaŭ“. A siahońnia faktam jošć, što pradstaŭleńnie naprykład, ci inšaja zabava ŭ takoj polskaj arhanizacyi tady tolki ciešycca ŭ nas udačaj, kali tam pradstaŭlajecca **biełaruskaja** sceničnaja štuka, śpiavajucca **biełaruskija** pieśni, deklamujucca **biełaruskija** vieršy. Hety pieravarot zrabiła nacyjanalnaja śviedamaść siłkom zahnanych siabroŭ. — Vot-ža heta samaja śviedamaść musić zrabić pieravarot i ŭ arhanizacyjach kooperatyŭnych, dzie dahetul niepadzielna panuje ŭsio inšaje, čužoje, ale nie svaja rodnaja **biełaruščyna**. A znača, pieršym krokam nakiravańnia miascovych kooperatyvaŭ da słužby svaim-ža siabram, jošć nacyjanalnaje ŭśviedamleńnie hetych-ža siabraŭ.

Chto-ž ich maje ŭśviedamić? Uśviedamić ich musić žyvoje słova i dobry čyn siabry śviedamaha, jakomu ŭ padmohu moža pryjści **biełaruskaje drukavanaje słova**: biełaruskaja knižka, časapis, hazeta. Dziela hetaha na nadychodziačych Ahulnych hadavych schodach u kooperatyvach, kožny siabra pavinien pierad usim być i tam nia spać. Prad takimi schodami treba kožnamu dobra ŭśviedamicca ŭ svaich pravoch, abaviazkach i patrebach, a na schodach — dobra słuchać i razabracca, čaho varta dahetulašniaja haspadarka kooperatyvy dy družna damahacca, kab zaaščadžany ŭ kooperatyvie hroš nia išoŭ na niejkija dalokija, niaviedamyja spravy, ale kab išoŭ na załažeńnie ci pašyreńnie miascovaj biblijateki, na fond budoŭli sobskaha domu kooperatyvy, na b i e ł a r u s k i j a kooperatyŭnyja i haspadarskija časapisy, na dapamohu b i e ł a r u s k i m kulturna-aśvietnym tavarystvam, biełaruskaj niezamožnaj ale pilnaj studenckaj i vučnioŭskaj moładzi. Słovam, nia možna dapuskać, kab zaaščadžany hroš uciakaŭ, ale treba pilnavać kab astavaŭsia pamiž svaimi ludźmi i dalej ich uspamahaŭ. Kab-ža lahčej i zručniej było ŭsiaho dapilnavać, treba damahacca, kab kooperatyŭnaje dziełavodztva jak u Upravie, tak u Nahladnaj Radzie i na Ahulnym Schodzie viałosia tolki ŭ ahulna zrazumiełaj biełaruskaj movie. Heta damahańnie zusim zakonnaje. A kali-b niechta niedapuskajučy biełaruščyny chacieŭ prykryvacca „zakonam“, ad hetkaha pana treba zažadać vyjaśnieńnia, dzie taki zakon jošć i ab usim nie maŭčać, ale zaraz-ža paviedamić choć-by našu redakcyju.

Čałaviek maje betulki pravoŭ, kolki ich zdabudzie i ŭtrymaje.

Uvaram da kooperacyi

Nadychodzić para ahulnych schodaŭ. I najmienšaja kooperatyva, kali tolki jana žyvaja, u hetu paru zmušana byvaje zrabić padrachunak svaje dziejnaści. Kali hety padrachunak pakažacca dadatnym — dobra, a kali tam akažucca straty — tady treba šukać pryčyn.

Adnej z najčaściejšych pryčyn stratnaj haspadarki ŭ našych kooperatyvach jošć niedastatak z pasiarod svaich miascovych ludziej śviatlejšych adzinak da kiravańnia spravami kooperatyvy. U adnym miescy takich ludziej sapraŭdy niama, a ŭ druhim choć jany i jošć, to adnak da pracy ŭ kooperatyvie nia hornucca. Adny tak robiać, bo spravy nie razumiejuć, a inšyja tamu, što ŭvažajuć kooperacyju za niešta čužoje, nasłanaje da nas pa toje, kab denacyjanalizavać naš narod, naš kraj. Chto spravy kooperacyi nie razumieje, dla taho mieŭ-by ja adno tolki pažadańnie, kab joj zacikaviŭsia i pračytaŭ ab joj prynamsi našu niebahatuju biełaruskuju litaraturu. Dla tych ža, chto da kooperatyŭnaj pracy nia prymykajecca, bajučysia, kab hetym nie prykłažyć ruki da varožaj našamu narodu pracy, dla ich maju tut z svajej kolkihadovaj pracy hetkuju zaŭvahu:

Nie sumlavajusia, što nie adzin z čužych u našaj kooperacyi pracaŭnikoŭ chacieŭ-by našu (miascovuju) kooperacyju pastavić na słužbu varožaj našamu narodu pracy. Heta praŭda. Ale praŭda i toje, što „natura nia cierpić pustaty“. Kali da kiravańnia kooperacyi ŭ nas z tych ci inšych pryčyn nie chapała ŭ svoj čas ludziej miascovych, dyk heta miesca zanial i da siahońnia trymajuć ludzi pryjezdnyja, čužyja, a jšče horš — roznyja na ŭsio hatovyja prysłužniki. Hety nienarmalny stan zamacavaŭ znovelizavany polski zakon ab kooperatyvach.

Jaki-ž z usiaho hetaha vychad dla kooperacyi, jak takoj, i jakija pavinny być adnosiny da jaje ś v i e d a m a h a biełarusa?

A voś jakija: Ništo samo saboj nia robicca; tymbolš nia robicca toje, što maje jści „proci vady“, bo, jak kaža paet naš M. Bahdanovič: „Prociŭ ciačeńnia vady zmoža tolki žyvoje papłyć, chvali-ž raki toje zaŭsiody niasuć, što skončyła žyć“. Siahońniašniaja aficyjalnaja na biełaruskich ziemlach kooperacyja płyvie z vodami čužymi. I niama, być nia moža nijakaj nadziei, kab sama praz siabie, biaz nijakaj pryčyny, heta kooperacyja „papłyła ŭ vody“ našy, biełaruskija. Śkiravać-ža hetu kooperacyju ŭ vody biełaruskija zmohuć tolki sami biełarusy. A dziela hetaha biełarusy sami pavinny da kooperacyi chinucca, u joj pracavać, da taho-ž — pracavać dziejna, achviarna, **u duchu kooperatyŭnym.** A kali naš čałaviek navučycca pakooperatyŭnamu pracavać, kali jon svajej śviedamaj pracaj daść našaj kooperacyi biełaruski źmiest, tady heta kooperacyja staniecca biełaruskaj i svajej formaj.

Kooperatyŭna-ђaspadarskija naviny.

Novaja hurtoŭnia sajuzu kooperatyvaŭ „Spolem!" U suviazi z tym, što za min. 1935 hod u Horadzienskim vokruzie było zasnavana šmat novych kooperatyvaŭ, dla absłužeńnia ich sajuz „Społem!" zasnavaŭ u Horadni hurtovy skład. Pavinna heta abnižyć handlovyja vydatki kooperatyvaŭ, a hetym samym abnižyć u ich canu samych tavaraŭ.

Zmiena zakonu ab stemplovych apłatach. Pačynajučy ad 15 studnia siol. apłaty stemplovyja ad rachunkaŭ zarachoŭvajucca ŭ padatak ad abarotu. Dzieła hetaha ad pakazanaha dnia nia treba apłačvać stemplem (hierbavym zboram):

1. Usiakija rachunki kupli-prodažy, špisy tabačnych sartoŭ, rachunki za sol i h. d.

2. Usiakija pakvitavańni ŭziatych hrašovych sum, cennych papieraŭ, veksaloŭ, čekaŭ, układaŭ na aščadnaść, pajoŭ, pensyjaŭ i h. d.

3. vypiski z biahučych rachunkaŭ pamiž kooperatyvami. Kali-ž kooperatyvy vydajuć hetkija vypiski asobam fizyčnym ci praŭnym, jakija nie handlujuć, dyk takija vypiski pavinny być apłačany stemplem pa 20 hrašoŭ ad arkuša.

4. volnaje tak-ža ad stemplovaj apłaty pačvierdžańnie salda pakupcom.

Narady ŭ spravie małačarstva adbylisia ŭ Vilenskaj Ziemlarobskaj Pałacie dnia 15 lutaha. U naradach pryjmali ŭčaście pradstaŭniki jak miascovaj kooperacyi, tak i administracyjnych uładaŭ. Ahułam raźbiralisia narakańni na nizkuju jakaść masła vyrablanaha ŭ miascovych kooperatyvach. Kab padniać jakaść vyrablanych małočnych praduktaŭ, było pastanoŭlena, što treba złučać kooperatyŭnyja małačarni ŭ adnu z abšaru 10 klm. ŭ kožny bok. U addalenych siołach majuć być arhanizavany addziely (filii) małačarni haloŭnaj, jakaja pavinna być u siaredzinie abšaru. Masła vyrablenaje na našych ziemlach adnak na vyvaz zahranicu rachavać nia moža, bo zhetul vielmi daloka da vyvoznaha portu (Gdyni) i tut niama adpaviednych składovych ustrojstvaŭ.

Apracа masła, na abšary Navahradčyny raźvivajecca jšče vyrab syraŭ.

Heta halina pradukcyi adnak jašče tolki pačynaje raźvivacca. Źvierniena ciapier uvaha na vyvučvańnie syravarskich majstroŭ, jakija i vučacca pry syravańni ŭ Dzikuškach. U Baranavičach-ža maje być pabudavany skład i daśpiavalnia syroŭ.

Niama łazy. Značnaj uspamohaj biezziamielnym i małaziamielnym moža być košykarstva: vyrab usiakich plecienych mebłaŭ i naahuł chatniaha inventara z košykarskaj łazy. Pavodle spravazdačy Vilenskaj Ramieśnickaj Pałaty, na abšary samaj tolki Vilenščyny jość kala 60 vykvalifikavanych majstroŭ košykarstva, jakija mahli-b dać pracu až 350 asobam. Heta mahčymaść adnak nia vykarystana z taje prostaje pryčyny, što na miescy niama hetulki košykarskaj łazy (vierby), kolki treba, a pryvoz jaje z dalokich miascoŭ (Rudnik n\Sanam) kaštuje vielmi doraha (18 zł. za 100 kilo, tady jak na miescy takaja łaza kaštuje ŭsiaho 75—60 hr.). Vyvad zhetul musić być taki, kab na piaščanych niaŭžytkach našy sialanie sadzili košykarskuju łazu: zbyt na jaje jość.

Budujuć mahazyny. Ab pavarocie „mahazynaŭ" (ssypak na zbožža) „Samapomač" užo niaraz pisała. Na budovu novych i papraŭku starych mahazynaŭ polski ŭrad vyasyhnavaŭ paŭtara mil. złotaŭ. Z hetaj sumy Biełastoččyna i Vilenščyna majuć atrymać pa 200 tys. zł. Košt pabudovy mahazynu abličany na 50.000 zł. Mahazyn taki maje pamiaščać 200—300 tonaŭ zbožža (tona maje 1.000 kilohramaŭ).

Jašče adzin padatak? Skarbovyja ŭłady razasłali ŭva ŭsie hminy nakaz sastavić špis usich sadoŭ, u jakich jość bolš jak 10 drevaŭ. Nakaz hety nia maje nijakich pajaśnieńniaŭ i tamu paŭstaje pavažnaje padazreńnie ci nia robicca hety špis pa toje, kab paśla abłažyć ułaśnikaŭ takich sadoŭ „adpaviednym" padatkam. U hetaj spravie Vil. Ziemlarobskaja Pałata mieła daviedacca u skarbovych uładaŭ, što aznačaje hety nakaz. Tymčasam adnak sialanie ŭstrymlivajucca ad zakładańnia sadoŭ naahuł. A kali katory z ich niešta ŭ hetym kirunku i robić, dyk, nia sadzić bolš jak 10 štuk dreŭcaŭ.

Kooperatyŭnyja pracaŭniki ŭ sučasnaj Polščy naahuł majuć vielmi trudnaje zadańnie, tymbolš ciažkaje zadańnie kooperatara biełarusa. Skazać treba prosta, što zadańnie heta zvodzicca da sapraŭdnaj baraćby za kooperatyŭny ideał. I najvažniejšaja sprava ŭ tym, kab hetaj baraćby nie bajacca, pamiatajučy, što **dzie niama baraćby, tam niama i pieramohi.**

Kapla pa kapli daŭbić navat kamień: ludzkija-ž dušy nie zaŭsiody byvajuć za kamień ćviardziejšyja. I tamu pieramoha na kooperatyŭnym froncie mahčymaja i ŭ nas, kali znojdziemo dosyć achviarnych svaich biełaruskich kooperatyŭnych pracaŭnikoŭ.

Dyk nie staraniemsia kooperacyi, ale jdziema ŭ jaje i pracujma!

M. S.

U 75-tyja ŭhodki skasavańnia panščyny.

19 lutaha (pa star. st.) siol. minaje roŭna 75 hadoŭ ad taho času, kali ŭ 1861 hodzie car Alaksandar II padpisaŭ „manifest" ab skasavańni panščyny va ŭsiej tahačasnaj rasiejskaj imperyi, a značа i na ziemlach biełaruskich. Manifest hety, pryhatavany ŭ „Dziaržaŭnaj Radzie" 7 lutaha, abjaŭleny byŭ u Rasiei 5 sakavika, a na Biełarusi — až 9 (st. st.) sakavika 1861 h. Nižej padajom vypisku z „Skasavańnia panščyny na Biełarusi" — A. Klimoviča, z kvartalnika „Калосьсе" za 1935 hod, bač. 119—125.

Važniejšyja pastanovy reformy 19.II.1861 h.

Paśla aficyjalnaha skasavańnia panščyny ŭsio haspadarčaje žyćcio — častkava i samaŭradavaje — kiravałasia: ahulnym zakonam („pałažeńniem") ab sialanach, što vyjšli z panščyny, pamiesnymi zakonami, asobnymi dla biełaruskich ziemlaŭ na ŭschodzie i asobnymi na zachodzie i šmat inšymi, specyjalnymi. Acenka hetych zakonaŭ vymahała-b špisańnia całych tamoŭ. Da atrymańnia ziamli, pavodle vydadzienaha zakonu, byli ŭpavažnieny tolki tyja poŭnaletnija panščyźnianyja haspadary, jakija byli ŭpisany ŭ ahulna rasiejski pierapis („reviziju") 1858 h. Ab samym-ža nadziele ahulna možna skazać, što jon byŭ tak abmierkavany, kab moh tolki pryviazać sialan da ziamli i hetym samym zabiaśpiečyć pamieščykam tannyja rabotnickija ruki dy pazvolić im zdavać ziamlu ŭ arendu za niačuvana vysokuju canu.

Aficyjalna, pavodle zakonu z 19.II.1861 h., sialanie da času ŭstanaŭleńnia „ŭstaŭnych hramat"*) astalisia na tych haspadarkach, dzie jany byli ŭprad „asvabadžeńniem" i adrablali za heta pastaromu panščynu ci płacili čynš umoŭleny ŭ inventarnych apisańniach.

*) „Ustaŭnyja hramaty" heta niby „kupčyja" na sialanskija nadziely. Musili jany być končany za 2 hady ad času vydańnia zakonu, h. zn. da 19.II.1863 h.

Сельская гаспадарка.

ГАСПАДАРКА У ПОЛІ

Што будзе сёлета з азімым збожжам?

„На Грамніцы—кажуць—зімы палавіца." А ў нас сёлета гэта першая „палавіца" дык праўду кажучы зімой і ня была. Гараджане гэткую зіму хваляць, бо менш патрабуюць апалу. Хваліць гэткую „лёгкую" зіму часам і наш селянін; але для яго „лёгкая" сёлетняя зіма мае й свае благія бакі. Маем тут на ўвазе азіміны, для якіх сёлетняя зіма хавае шмат і шмат небясьпекаў.

У чым-жа тут справа?

А вот у тым. Праз цэлы сьнежань і студзень месяцы сьнег колькі разоў пакрываў незамарожаную рунь, якая, ня будучы ўспоенай марозам на зімовы адпачынак, пад сьнегам душылася ад недастатку паветра. Адно шчасьце, што гэткі сьнег у 1-шай палове зімы доўга не ляжаў і па колькіх днёх таіў, каб за пару наступных дзён узноў насьнежыць і так-жа нанова растаяць.

Гэткае колькіразовае чаргаваньне сьнегу з дождажам ці толькі звычайнай адлігай, вельмі шкоднае. Але блізу йшчэ больш небясьпечным зьяўляецца стан сучасны (ад першых дзён м-ца лютага), калі на незамарожаную зямлю насьнежыла вельмі многа сьнегу і гэткі сьнег трывае даўжэйшы час. Яшчэ палова бяды, покуль трываюць маразы і сьнег больш-менш пухкі (пульхны). Горш аднак будзе, калі гэты сьнег будзе таяць паволі, зьліваючыся ў ледзяную глыбу; а йшчэ горш — калі гэтыя зьлітыя, зьледавацелыя глыбы сьнегу пралежаць да м-ца красавіка. У гэткім выпадку пагражае засьнежанай азіміне падвойная небясьпека: уся рунь, збуджаная вясьняным сонцам да жыцьця і ня могучы мець доступу да вольнага паветра, можа задыхацца ад нястачы гэтага паветра. Яшчэ ў горшым палажэньні апыняецца рунь з сяўбы заражанай сьнежнай цьвільлю (Fusarium nivale). Зародкі гэтага грыбка вельмі пашыраны (на зярняці і ў самай глебе), але разьвіваюцца яны толькі пры недастатку вольнага паветра ў цяпле і вогкасьці. А гэтыя варункі якраз і могуць мець месца сёлета.

Што-ж можа чалавек проціў гэткіх капрысаў прыроды зрабіць?

Проціў грыбка Fusarium nivale ёсьць помач вельмі скуткоўная: байцаваньне (атручваньне, заморываняне) насеньня адумыснымі парашкамі. Але гэты спосаб можна браць пад увагу толькі прад пасевам. Сягоньня-ж, калі зерне ня то што пасеена, але і ўзыйшло ды зарунела, сягоньня як проці самай сьнежнай цьвілі, так і проці задушэньня расьліны ад нястачы вольнага паветра можна стасаваць адзін толькі спосаб—нішчэньне сьнежнай кары ў помач вясьнянаму сонцу і ветру.

Як гэта практычна рабіць?

Звычайна поле бывае засьнежана ня роўным пластом, але ў адным месцы яго бывае больш, у другім менш. Тонкі пласт сьнегу ад дзеяньня сонца і ветру звычайна сам лёгка сходзіць. У тых-жа мясцох, дзе сьнегу навявае больш (пад касагорамі, высокімі межамі і г. д.), таб трэба ўжо ў сакавіку (марцы) месяцы парасколываць зьледзянелыя глыбы сьнегу ломам, рыдлёўкай ці нечым падобным: сонца і вецер гэту працу дакончаць.

U spravie vykupnoj cany zakon ustanaŭlaŭ ćviorduju canu tolki na sialiby i aharody, a ab reŝcie treba było sielaninu „volna" ŭhavarvacca z pamieŝčykam. Pry vykupie ziamli asabliva ciažkaj dla sialan była h. zv. s y s t e m a h r a d a c y j, pavodle jakoj pieršaja dziesiacina nadziełu canilasia jak pałova ŭsiaho nadziełu, druhaja dziesiacina — jak čviortka hetaha nadziełu, a ŭsia rešta razam uziataja — taksama jak čviortka. Pry hetaj systemie vykupu pamieŝčyki faktyčna brali zabaronieny aficyjalna vykup asoby sielanina.

Tych sialan, katoryja „dabravolna" adkazvalisia ad prava na nadzieł, zakon pazvalaŭ nadzialić čviortkaj naležnaha im nadziełu, ale biaspłatna. Skarystali z hetaha asabliva bujnyja pamieŝčyki, a sialanie — „darstvieńniki" — stalisia pieršymi kandydatami ŭ batraki i da žabračaj torby.

Vypłata nadziełu była tak abdumana, što sielanin mieŭsia spłačyvać svoj nadzieł kaźnie ŭ praciahu 49 hadoŭ, a kazna sama razrachoŭvałasia z pamieŝčykami. Hetak ustanoŭlenaja spłata miełasia končycca tolki ŭ 1932 h., ale skončyłasia ŭžo pa pieršaj rasiejskaj revalucyi, u 1905 h.

Ustanaŭlaŭsia ŭreŝcie viaskovy samaŭrad, z svaimi schodami i svaim vałasnym sudom.

Pamiesnyja zakony dla biełaruskich ziamiel.

Pamiesny zakon dla ŭschodnich biełaruskich ziemlaŭ — adnolkavy z zakonam dla ziemlaŭ vialikarasiejskich — ustanaŭlaŭ dva raźmiery nadziełaŭ: vyšejšy i nižejšy. Nižejšy nadzieł raŭniaŭsia adnej tracinie nadziełu vyšejšaha. Vyšejšy nadzieł u hetaj čaści Biełarusi pa pavietach pradstaŭlaŭsia hetak: pa $3^1/_2$ d z i e s i a c i n y*) u Smalenskim paviecie, pa 4 d z i e s i a c i n y — u pavietach: Mścisłaŭskim, Jelnickim, Krasienskim i Rosłaŭskim; pa $4^1/_2$ d z i e s i a c i n y — u pavietach: Viciebskim,

*) Na „revisskuju dušu", h. zn. na poŭnaletniaha mužčynu zapisanaha ŭ 1858 hodzie.

Падумайце аб сенажацях!

„Не тады сабак карміць як трэба ўжо йсьці на паляваньне“. Вот-жа, хоць яшчэ палі й сенажаці пакрыты сьнегам, то ўжо пара думаць аб тым, як паправіць нашы сенажаці й пасьбішчы, каб на іх, замест дагэтуляшняга пустазельля й асакі, расла сочная й сытная трава. Паправы вымагаюць сенажаці, калі на іх ёсьць: кусты, курганы (капцы), кратовыя кучы, мох, лішняя вогкасьць (балоцістасьць) і г. д., а так-жа калі сенажаць перастане радзіць. Пачнем папарадку:

1. Калі на сенажаці растуць кусты лазы, ялаўцу ці якія іншыя, дык іх раньняй вясной трэба павысякаць і павыкопываць з каранём. Усякае каменьне трэба старанна пазьбіраць, кратовыя кучы раськідаць лапатай або разбаранаваць.

2. Вялікім непрыяцелям сенажаці ёсьць мох. Вясна — найбольш прыгодны час да таго, каб гэты мох выкараніць. Звычайна мох расьце на сенажацях за лішне вогкіх і таму на барацьбу з ім трэба падлавіць такі мамэнт, калі зыйдзе ўжо сьнег, адтае верхні пласт зямлі (сам мох), а сподняя часьць грунту бывае йшчэ на гэтульки зьмерзлай, што ўтрымлівае ад правальваньня ня толькі чалавека, але і каня з бараной. Важна гэта дзеля таго, што мох найлепш выдзіраць з сенажаці вострай жалезнай бараной, каторую найлепш пускаць крыжам і да таго часу, пакуль сенажаць ня станецца чорнай. Выбаранаваны мох трэба зграбіць, на месцы спаліць, а попел тут жа растрэсьці.

3. Цяжэйшая справа, калі сенажаць падмоклая і праз гэта або зусім ня здольна даць ніякага сена, або там расьце толькі асака. Тут ужо няма іншай рады, як пракапаць адкрытыя або закрытыя равы. Сама сабой гэта работа ня так і трудная, але нагляд фахоўца (агранома-мэліоратара) тут вельмі патрэбны, бо йнакш замест помачы можа быць шкода. У грунтох вязкіх і тарфяністых адкрытыя равы мусяць быць мялчэйшыя чым у грунтох пескаватых.

4. Сенажаці, на якіх перастае расьці сытная трава і астаецца толькі пустазельле, паказваюць, што з іх высмактаны ўжо кармовыя запасы і наступіў голад. Трэба ў такіх выпадках сенажаць падкарміць (пагнаіць). Якога гною сенажаць патрабуе відаць з таго, што на ей расьце. Калі між травастану няма ніводнай травінкі канюшыннай, а за тое расьце шчаўе ды румянак, дык гэта знак, што сенажаць патрабуе, вапны і попелу Сенажаці сухія, на якіх хоць і расьце канюшына, але яна дробная, патрабуюць кампосту і гною хлеўнага.

5. Урэшце справа гэтак званага адмалоджваньня сенажаці, калі на ёй па пэўным часе перастаюць расьці добрыя травы. Гэткія сенажаці адмалоджваюцца гэтак: наўперад яе добра барануюць, каб дзярно дакладна разьдзерці. Можа гэта ўдасца зрабіць і звычайнай бараной, але найлепш да гэтага адпаведныя бываюць бароны талеркавыя і скарыфікатары—бароны, у якіх замест звычайных зубоў панасаджваны нажы, якія

Калі ж нейдзе сьнежная пакрыва бывае большай (шырэйшай, даўжэйшай), там найлепш запрэгчы каня ў цяжкую жалезную барану, ці йшчэ лепш — у драпак і гэтак праехаць разоў колькі (найлепш — накрыж); сьнег ад гэтага зробіцца сітаваты і хутчэй гіне.

Урэшце, тым ці гэтым спосабам, але сёлета трэба ўсе сілы на тое пакласьці, каб сьнег не ляжаў на полі і аднэй лішняй гадзіны.

А. К.

Lepielskim, Nievielskim, Siebieskim, Homielskim, Klimavickim, Kapyskim, Mahileŭskim, Aršanskim, Sieńninskim, Čaŭskim, Čerykaŭskim, Bielskim (Smal. hub.), Darahabuskim, Duchaŭščynskim i Pareckim, pa 5 dziesiacin — u pavietach: Haradzieckim, Połackim i Suraskim i pa $5^1/_2$ dziesiacin — u pavietach: Vialiskim, Bychaŭskim i Rahačeŭskim.

Za ŭstanoŭleny takim čynam vyšejšy nadzieł toj-ža zakon ustanaŭlaŭ nastupny abrok: pa 8 rub. — u biełaruskich pavietach Viciebščyny i ŭ pavietach: Bielskim, Darahabuskim, Duchaŭščynskim, Jelninskim, Krasienskim, Pareckim, Rosłaŭskim i Smalenskim — Smalenskaj hub., pa 9 rub. uva ŭsiej Mahileŭščynie.

Pryhonu (raboty) za adzin vyšejšy nadzieł u tej samaj časci biełaruskich ziemlaŭ naznačałasia 40 dzion mužčynskich i 30 dzion žanockich.

Varunki nadziełu i spłaty ŭ biełaruskich pavietach Čarnihaŭščyny byli inšyja. I tak: u pavietach Staradubskim i Čarnihaŭskim vyšejšy nadzieł aharodniaj ziamli vynosiŭ 4 dziesiaciny, a vyšejšy raźmier piešaha ŭčastku (?) polnaj ziamli — 6 dziesiacin. Adpaviednyja nadziełу ŭ pavietach: Mhlinskim, Suraskim i Navazybkaŭskim byli $4^1/_2$ i 7 dziesiacin Za dziesiacinu polnaj ziamli ŭ pieršych dvuch pavietach zakonam u hod było naznačana 14 dzion pryhonu abo 1 rub. 60 kap. čynšu, a ŭ apošnich troch pavietach — 12 dzion pryhonu abo 1 rub. 40 kap. čynšu.

Na zachodnie-biełaruskich ziemlach pavinnašci sialan za nadzieł i dalej, da času „ŭstaŭnych hramat“, kiravalisia zabaviazańniami Inventarnych Kamitetaŭ, z niaznačnymi tolki ablahčeńniami, kasujučymi pavinnašci dadatkavyja i račovyja. Rabočy dzień uletku rachavaŭsia 12 hadzin, a ŭzimku—9 hadzin. U „liflandzkich“ pavietach Viciebščyny (Dźvinsk, Drysa, Lucyn, Režyca) lik pracoŭnych dzion za nadzieł chistaŭsia ad 12 da 23, zaležna ad taho, da katoraj z 9-cioch katehoryjaŭ nałežaŭ dadzieny dvor.

і рэжуць дзярно, дапускаючы туды паветра. Парэзанае дзярно раўнуецца адумыснай бараной да сенажацяў, гэтак званай ланцуговай і на прыгатаваную гэтак сенажаць высейваецца мешанка травянога насеньня. Адну толькі да гэтага раблю засьцярогу: калі хто замест добрай мешанкі, купленай у салідных фірме, хоча пасеяць нейкія высеўкі ці наагул „таннае“ насеньне, дык хай лепш адмалоджваньня сенажаці не пачынае.

Лугавод.

Якія буракі і куды сеяць.

Аднэй з найбольш паплатных і спорных пашаў для скаціны ёсьць кармовы бурак. Паплатнасьць яго ў тым, што з адзінкі плошчы поля мы дастаём вялікую колькасьць самага бурака, а акрамя таго і лісьцё бурака чыста сабранае і заквашанае дае ўзімку добрую пашу, якая замяняе пашу зялёную.

Сягоньня маем чатыры найважнейшыя сарты кармовых буракоў: **Эккендорф жоўты і чырвоны, Мамут, Обэрндорф і поўцукровы.**

Эккендорф і Обэрндорф лепш падходзяць на грунты цяжэйшыя, дзеля таго, што растуць яны наверсе. Але можна іх садзіць і на грунты лягчэйшыя. Мамут сеецца пераважна на грунтох лягчэйшых, бо ён можа запускаць карэньне ў сподныя пласты глебы. Буракі поўцукровыя ўдаюцца на ўсякіх землях і таму я іх сеіў-бы найахватней. Акрамя таго, што яны маюць большую вартасьць аджыўчую, маюць яны і большы працэнт цукру.

Грунт пад буракі павінен быць сярэдні, ані за цяжкі ані за лёгкі, правеўны, прапускны, ані падмоклы, ані за сухі. Ральля павінна быць скрозь старанна выраблена (пухкая, глыбака ўзараная. Дзеля гэтага бурак трэба сеяць пасьля збожжа, каб ад восені мець досыць часу на выпраўку ральлі.

Першай працай па прыбраньні з поля збожжа ёсьць мелкае ўзараньне аржышча, каб яно ў ральлі раскладалася, перагнівала, а насеньне ўсякага пустазельля, каб да восені йшчэ абыйшло, а ўзімку — вымерзла. Узаранае аржышча валуецца цяжкім гладкім валам: ськівы зямлі адна да другой больш прыціскаюцца, а праз гэта сыспаду хутчэй падыймаецца грунтавая вогкасьць, якая прысьпяшае працэс гніцьця заараннага аржышча. Увосені можна йшчэ прыараць навезены хлеўны гной, але можна гэта зрабіць і на вясну (на грунтох лягчэйшых — *рэд.*).

Прад самым засевам трэба памятаць аб тым, што ральля мусіць быць добра прыбіта валам (звалаваная), каб конскія капыты пакідалі па сабе толькі нязначныя сьляды. Прыступаць да засеву можна толькі тады, калі ральля ўжо цьцёрдая. Таму стараннае валаваньне ральлі прад пасевам уважаю за канешнае.

Калі буракі абыйдуць і маюць па два лісточкі, тады ўзварушваем між імі зямлю матыкаю, каб не выпароўвалася вада. Калі-ж зьявяцца ўжо чатыры лісточкі, прарываем (прарэджваем) буракі так, каб каліва ад каліва было толькі на адлежнасьці 20—25 см.


Пасьля наступае самая ўправа і дагляд: нішчэньне ўсякага пустазельля, колькіразовае матыкаваньне прарэджаных буракоў паміж радкоў, а ўвосені — капаньне (збор). Важна тут, каб з буракоў прадчасна не абрываць лісьця (націньня), бо тады бурак не расьце.

Частым шкоднікам бурака ёсьць чорная мшыца, якую можна нішчыць табачным адварам, або вапнянай вадой; скропліваецца імі лісьцё бурака.

Abaviazki čynšovych sialan na zach.-biełaruskich ziemlach abličalisia, pavodle zakonu, na padstavie ahulnaj vartaści (ŭ hrašach) pavinnaściaŭ zapisanych u inventarnym apisańni, ale nia bolš 3 rub. za dziesiacinu nadziełu. Tyja-ž abaviazki sialan za dziesiacinu nadziełu ŭ Viciebskich pavietach chistalisia, zaležna ad katehoryi dvoru (1—IX), pamiž 1 rub. 65 kap. i 3 rub.

Usio heta tolki suchija normy zakonu, jaki mieŭsia abaviazyvać na našych ziemlach ad 19.II.1861 h. Žyćcio adnak šmat źmianiłasia, addajučy kiraŭnictva sialanskim pytańniem taho času ŭ ruki pierad usim hetak zvanych „Hubernskich kancelaryjaŭ dla sialanskich spravaŭ“*). Rasśledavańnie archivaŭ hetych ustanovaŭ — siahońnia na vialiki žal mała, a pa čašci i zusim niedastupnych — pavinna kinuć bolš śviatła na całuju spravu. Siahońnia-ž, aceńvajučy samy akt 19-ha lutaha 1861 h. z perspektyvy troch čviertak stahodździa, nia možna nia pryznać pracy i dobraj voli tych ludziej, katoryja hety zakon staralisia praviašci.

Na svaju paru byŭ heta pačyn nie mały. Kab skasavać adnak panščynu i ŭsio, što z joj łučyłasia, samaha tolki zakonu było jašče mała. Dla sapraŭdnaha raskrepaščeńnia sialanstva patrebny byli silnyja ludzi, jakija padčas uzrastańnia na sile reakcyjnych kołaŭ nia mieli dostupu da ŭradavych ustanoŭ. Tamu iskra voli tlieła až da času 1-aj (1905-6 h.) i asabliva 2-oj (1917 h.) rasiejskaj revalucyi, vybuchajučy padčas hetaj apošniaj u vialiki pažar, jaki nie zahas jašče da siahońnia i jaki napeŭna nie supakoicca datul, pakul čałaviek naš nia tolki na słovach, ale i na dziele nie pierastanie być pryhonnym niavolnikam dy nie zažyvie na svajej ziamli, jak niepadzielny haspadar.



*) „Gubiernskija po krestjanskim diełam prysutstvija“.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

Як паправіць гадоўлю.

Маю тут наўвеце перадусім гадоўлю скаціны, хоць у роўнай меры гэта самае можна сказаць і аб гадоўлі сьвіней, коняў, авечак і іншай хатняй асвоенай жывёлы.

Пры сягоньняшніх парадках аплачваецца толькі гадаваньне добрай жывёлы. Гэтак справа стаіць з скацінай малочнай, мясной і інш. І гэта зразумела. Менш зразумелым ёсьць пытаньне, скуль гэтыя „добрыя“ штукі жывёлы ўзяць. Найпрасьцей-бы было — здавалася-б — такую жывёлу купіць.

Пэўна-ж, гэта дарога можа найпрасьцейшая, ці вярней сказаць—найскарэйшая Але... на куплю добрай штукі якой колечы жывёлы трэба нямала грошаў; а да таго, найлепшая жывёла, трапіўшы ў рукі няўмелага гадаўца, можа сапсавацца ўжо за два гады. Дык трэба пашукаць такіх спосабаў папраўы гадоўлі, якія менш каштавалі-б і былі-б больш трывалкімі. Прасьцей кажучы, трэба ўспомніць галоўныя правілы жывёлагадоўлі і параўняць іх з практыкай сярэдняга нашага земляроба-жывёлагадаўца.

Вот жа адным з аснаўных правілаў жывёлагадаўлянай насьледнасьці (Erblichkeit — dziedziczność) ёсьць залежнасьць насьледных свомасьцяў ад свомасьцяў бацькаўскіх. Дзеля таго аднак, што ў жывёлагадоўлі адна адзінка мужскога роду прыпадае на колькі дзесяткоў адзінак роду жаноцкага, — значэньне стараны мужской практычна мае значэньне рашаючае. Такім чынам у гадоўлі скаціны аб насьледных свомасьцях рашаюць свомасьці бугая, у гадоўлі коняў — свомасьці жарабца, у гадоўлі сьвіней — свомасьці кнура і г. д.

Залежа гэта ад кірунку гадоўлі: адны свомасьці важны напрыклад для гадоўлі скаціны тыпу мяснога, іншыя — для тыпу працоўнага, яшчэ іншыя — для тыпу малочнага. Нас тут цікавяць свомасьці тыпу апошняга — малочнага. Разгледзім іх:

Кожная гадаўляная штука жывёлы павінна быць здаровай і добра цялесна збудаванай. Толькі гэткая жывёла можа быць прадуктыўнай. Што датыча ўрэшце самай малочнасьці, дык асабліва важна бывае прасачыць, якая была малочнасьць продкаў дадзенага бугая. Памятаць пры гэтым трэба, што пры скрыжаваньні горшых свомасьцяў з боку бугая з лепшымі свомасьцямі з боку самкі — каровы, блізу заўсяды бяруць верх горшыя свомасьці бугая. Дзеля гэтага трэба асабліва зорка сачыць за тым, каб бугай быў з лініі **добра малочнай**.

Ведаючы гэта аснаўное правіла насьледнасьці, трэба ў практыцы кіравацца гэткімі правіламі:

1. Кожны ўласьнік дойнай каровы, калі хоча выгадаваць ад яе добра-малочную карову, павінен загадзя мець на воку добрага, з малочнай лініі паходзячага бугая і ў разе патрэбы зараз-жа даставіць да яго сваю карову.
2. Ніколі ня можна дапускаць каровы да люзам ходзячага па пасьбішчы бугая дзеля таго толькі, што аплата за гэтага бугая меншая, а то і зусім ніякая не бярэцца.
3. Колькі грашоў ці хоць-бы і цэлая нават залатоўка заашчаджаная на выбары горшага бугая ў канцы канцоў заўсяды акажацца стратай, бо ад горшага бугая будзе горшае і патомства.
4. Гадаўляны закон ужо срога карае кожнага, хто карыстаецца ці дае карыстаць бугая незацьверджанага адумысловай гэтак званай ліцэнцыйнай камісіяй.
5. Найпрасьцейшы, найтанейшы і таму кожнаму даступны спосаб папраўы гадоўлі гэта **ўжываньне** толькі **добрых бугаёў**, якія паходзяць ад малочных кароў.

А. К.

Перахоўвуецца кармовы бурак, як і бульба, у ямах, капцох, а лісьцё заквашваецца ў ямах і ўзімку скормліваецца скацінай.

Кармовая вартасьць бурачанага лісьця ёсьць досыць вялікая, бо адзін кілёграм лісьця мае ў сабе 5—10 грамаў бялка. На дарослую штуку скаціны даецца ў дзень 15—20 кілёграмаў квашанага бурачанага лісьця. Цельным каровам, на два месяцы прад ацяленьнем, квашанай пашы даваць ня можна.

Самыя кармовыя буракі маюць 82 прац. вады, 5-9 прац. цукру, а рэшта прыпадае на бялок, крахмал і тук. Буракі можна даваць цялятам ужо ад 4 га месяца іхняга жыцьця, ад 1 го кілёграма пачынаючы і ўверх. Гадавой цялушцы можна ўжо даваць ў дзень 7—9 кілёграмаў, а дойным каровам — 25—40 кілёграмаў някроеных буракоў.

Інж. М. Д. („Сіль. Госп.“).

Конскія наровы і іншыя благія прывычкі.

Наравісты конь ня ёсьць хворы: ён толькі набыў благі навык. Найчасьцейшай прычынай наравістасьці ў каня зьяўляецца няўмелае прывучваньне каня да запраганьня, беспатрэбнае біцьцё і пужаньне. Ад гэтага часта і спакойныя коні робяцца наравістымі, калі іх бяз цай-прычыны чалавек карае, або прымушае цягнуць непасільна вялікі цяжар, або ўрэшце калі недапасаваная упраж муляе ў адным ці колькіх мясцох.

Наагул наравістага каня вельмі цяжка зрабіць паслушным і трэба шмат зазнаць клопату, каб абмылку паправіць. Раз на заўсяды трэба запамятаць, што біцьцём, крыкам тут нічагусенькі зрабіць ня можна, наадварот — з жывёлай трэба заўсяды абходзіцца бярэжліва, мякка, ласкава, — тады толькі можна спадзявацца, што ўдасца абмылку направіць.

Акрамя агульнага нарову або ўпартасьці, бываюць у коняў яшчэ іншыя прывычкі, каторыя зьмяншаюць вартасьць каня, а часам робяць ягонаму ўласьніку не малы клопат. Сюды належаць: прыкуска, кусьлівасьць, высуваньне языка, „прымочка", пужлівасьць. Разгледзім, хоць коратка, усё гэта папарадку:

Прыкуска і кусьлівасьць — гэта дзьве розныя дурныя прывычкі, хоць і называюцца неяк падобна. Пры прыкусцы конь грызе ўсякія прылады, снасьць, упраж, а пры кусьлівасьці — стараецца ўкусіць чалавека. Коні з прыкускай, падобна як скаціна хварэючая на лізуху, ліжуць усьцяж муры, жлабы, ясьлі, грызуць дошкі, разгрызаюць упраж і ўсё іншае, што толькі ім пападзецца на зубы. — Каб адвучыць каня ад гэтай брыдкай і шкоднай прывычкі, карыстаюцца людзі дзёгцем, нафтаю, або гэтак званай сьмярдзючай смалой, стручкаватым (чырвоным) перцам і інш., якімі абмазываюцца ясьлі (драбінкі), дошкі, кантары і ўсё іншае, што можа конь грызьці. Хто можа, той абівае ясьлі і жлабы бляхай. Коняў „з прыкускай" ня можна трымаць разам з конямі, якія гэтай прывычкі ня маюць, бо йнакш і гэтыя апошнія, гледзячы на першых, пачынаюць так-жа грызьці ўсё навокал сябе. — Агулам ўзята, каня прызвычаенага да „прыкускі" адвучыць цяжка: яго цягне да гэтага, як—не мяркуючы—п'яніцу да чаркі.

Кусьлівы конь — кусае чалавека. Ад гэтай прывычкі часам удаецца адзвычаіць каня гэткім спосабам: на палачку надзяецца гарачы печаны бурак (ці рэпа). Калі конь кідаецца да чалавека, каб яго ўкусіць, дык такому каню падстаўляецца пад зубы гэты бурак, каторым ён папячэцца. Колькі дзён пасьля гэтага, покі месца прыпёку не загоіцца, конь ня кусаецца, але пасьля прывычка аджывае нанова. Часта аднак здараецца, што калі такая проба з гарачым буракам паўторыцца якіх тры-чатыры разы, дык конь сваю прывычку кусаньня пакідае.

Высуваньне языка ў каня гэта прывычка ня гэтулькі шкодная, колькі прыкрая, бо такі конь становіцца падобным да сабакі ў гарачы дзень. Каб гэту прывычку ў каня выкараніць, некаторыя гаспадары навязваюць на цуглі вузлы, аб якія конь абціраe свой язык і быццам забываецца на сваю прывычку. — Іншыя гаспадары перавязваюць каню язык тоненькай тасемкай: але — увага! каб ня выклікаць запаленьне языка.

„Прымочка" ў каня гэта такая благая прывычка, калі на сьцёбаньне бізуном такі конь адказвае спусканьнем мачы. Калі гэтак робіць конь ці жарабец — дык малая там бяда. Горшая аднак справа з кабылай, каторая ў такім выпадку часта „паліваe" і самага фурмана. Рада на гэта адна: лішне ня сьцёбаць каня наагул (у Англіі напр. законам забаронена сьцёбаць каня), а паганяць яго голасам. Тым-жа капрысным кабылам, што гэты брыдкі звычай маюць і бяз бізуна ня слухаюць, прыходзіцца перад кожнай дарогай навязываць падхвосьнік з звычайнай чыстай парцянкі.

Урэшце пужлівасьць ці палахлівасьць каня. Прычынай гэтага найчасьцей зьяўляецца „блізарукасьць" каня: конь кепска бачыць і таму пужаецца. Пазнаць палахлівага каня можна ўжо паводле таго, што вочы ў яго звычайна бываюць круглыя, „баранія" і сядзяць наверсе. На верхніх павеках у гэткіх коняў бывае шмат зморшчкаў, а вушмі яны стала рухаюць („стрыгуць"), нават стоячы ў стайні. А гэта таму, што такі конь хоча вухам злавіць тое, чаго ня можа пабачыць вокам. — Гэты недастатак каня — палахлівасьць прычыненая сьлепаватасьцю — можа сапраўды ўважацца і як хвароба, тымбольш што памагчы такому каню ўжо надта цяжка. Ужываюць, праўда, да гэтага ўсялякіх „акуляраў" і „навочнікаў", якіх заданьнем ёсьць прыкрываць вока, як толькі надарыцца каню нешта „страшное": цягнік, аўта, усялякі стук, сільнае сьвятло і г. д.

Ю. З.

Хто сапраўды хоча, каб „Самапомач" часьцей прыходзіла і больш зьмяшчала ў сабе ўсякіх радаў, той павінен сам акуратна прысылаць складку на часапіс і дапільнаваць, каб гэтак рабілі так-жа суседзі. Найлепшшы на гэта спосаб, гэта выпісваньне часапісу „дзесяткамі." Аб варунках такога выпісваньня глядзеце на 2-гой бачыне вокладкі.

Як выкарміць скаціну хутка і танна.

На збыт адкормленай скаціны адчыніўся загранічны рынак... Правільнае адкормліваньне скаціны можа нават у сучасных цяжкіх часах прынесьці даход, бо дае магчымасьць выкарыстаць усю пашу, на каторую няма купца, наўперад на адпадкі, што хутка псуюцца. Адкормленая скаціна на рынку плаціцца далёка лепш чым худая, бо мяса яе клустае, сачыстае і смашнае. Гэта паясьняецца наступным параўнаньнем

	У працэнтах мязіва	туку	вады
Мяса нявыкармленага вала мае	30.8	8.1	59.7
Мяса выкармленага вала мае	35.6	22.9	39.0

З гэтага параўнаньня бачым, што мяса худой скаціны мае 60% вады і ёсьць лыкаватым, а мяса выкармленай жывёлы мае толькі 39% вады і ёсьць смашным і сачыстым. Затое мяса выкармленай жывёлы ёсьць пажыўнейшае, смашнейшае ад мяса худой жывёлы. Гэтыя розьніцы часам бываюць гэтак вялікімі, што найгоршае мяса клустай жывёлы ёсьць лепшым, чым найлепшае мяса жывёлы худой. Справядліва дзеля таго на краёвых і загранічных рынках устанаўляецца вялікая розьніца ў цэнах на выкормленую і худую скаціну. Гэта павінны выкарыстаць нашы гаспадары ды брацца да выкормліваньня.

Пры выкорміваньні жывёла мусіць вытварыць як найбольш мяса і туку (клустасьці). Мяса гэта ўсе мускулы і яны прарастаюць тукам. Тук найбольш нарастае пры нырках, але творыцца яго таксама шмат па ўсім целе жывёлы, пад скураю. Прырост на вазе пры выкормліваньні складаецца пераважна з туку і павінен прыбываць у дзень у правільна гадаванай штукі паўтара да двух кілёграмаў. Прырост залежа ў першую чаргу ад здольнасьці жывёлы перамяняць спажыву ў тук, а так-жа і ад пашы.

Ня ўсякая жывёла вытварае з аднолькавае колькасьці пашы туюсамую колькасьць туку. Дзеля таго і на выкормліваньне трэба выбіраць:

1. Жывёлу, якая хутка расьце, — добра выкарыстоўвае пашу,
2. Здаровую, бо хворая жывёла марнуе пашу і не адкормліваецца,
3. Жывёлу, якая мае нахіл да таўсьценьня,
4. Жывёлу спакойную, а ня жывую, рухлівую, бо шмат пашы было-б выкарыстана на рух,
5. Жывёлу маладую, якая кончыла свой рост, бо тады добра выкарыстывае пашу і хутка прыбывае на вазе.

Акрамя гэтых прыметаў паадзіночных штук жывёлы, трэба йшчэ ўзяць пад увагу пойлу і пашу. Пры выкормліваньні лепш даваць крыху грэтую ваду і нават нясьцюдзёную пашу, бо тады паша не выкарыстоўваецца на аграваньне астуджанага цела але перамяняе яе на тук.

На выкормліваньне жывёлы можна браць усякую пашу, якая ёсьць у гаспадарцы. З аб'ёмістай пашы трэба даць дарослай жывёле 4 да 5 кілёграмаў сечкі і 5 да 6 кілёграмаў сена. З акопнінаў найлепш прыгодна параная бульба, на дзень 14 да 18 кілёграмаў, або сырыя буракі 15 да 20 кг. Калі даецца менш буракоў і больш сечкі, тады лепш буракі парыць. Хто жыве блізка цукраварні ці бравaрні, можа даваць у дзень на дарослую штуку 1 да паўтара клг мэлясы або 30 да 40 клг. брагі.

Акрамя гэтай пашы, вельмі важнай ёсьць абсыпка. Ня можна даваць аднароднай абсыпкі, бо жывёла тады кепска яе выкарыстоўвуе. Найлепш мяшаць па роўных часьцях грыс, абсыпку ячменную, кукурузяную, з бобу і з выкі. Абсыпку трэба даваць дзеля таго, каб жывёла лепш зьядала іншыя пашы. Каб абсыпкі не марнаваць, ня можна даваць пры выкормліваньні зразу шмат абсыпкі, а толькі пастулова. У першым тыдні, калі жывёла галодная і есьць добра аб'ёмістую пашу, абсыпкі даваць ня трэба. Па тыдні даецца поўкілёграма абсыпкі і прыдаецца што 5-ты дзень па поўкілёграма, аж покуль дойдзецца да 5—6 кілёграмаў. Акрамя абсыпкі трэба дадаваць у пашу кухонную соль, на дзень 40 да 60 грам на штуку.

Выкормліваньне дзеліцца звычайна на тры водступы часу, з якіх кожны трывае 1—2 месяцы. Першы водступ (пара) гэта падгатоўка. У гэтым часе даецца жывёле лепш вартасная паша, і жывёла досыць хутка прыбывае на вазе, паўтара да двух клг. ў дзень. Пры канцы першай пары жывёла набярэ на сябе мяса.— Другая пара (водступ) вельмі важная, бо жывёла прыбірае на вазе таксама да 2 клг. у дзень, ня есьць ужо так пражорліва і дзеля таго трэба прыдаваць больш абсыпкі і лепшай пашы. Пры канцы гэтай пары прыбывае ўдзень ўжо толькі 1 да паўтара клг., жывёла становіцца пераборлівай. Каб больш ела, трэба прыдаваць пашу, якая дражніць ворганы траўленьня і павялічвае апэтыт, як: сода, серкавы цьвет, касьцяны попел, тоўчаныя скарупы з яёк ды запашныя расьліны, як: кмін, аніж, фэнікль ды ялавец. Гэтыя дадаткі ня толькі павялічваюць апэтыт, але прычыняюцца да лепшага выкарыстываньня пашы. Пры канцы гэтай пары скаціна ўжо бывае даволі выкармленая.

Дзеля таго што ня ўсякая жылёла аднолькава выкормліваецца, трэба кантраляваць прырост на вазе ці хоць-бы рукамі. Калі ўзяўшы ў жменю скуру

а) пры насадзе хваста, па абедзьвюх старонах,

б) у пахвінах, дзе скура пераходзе з задніх ног у падбрушша,

в) на мастку грудзіны,

г) на жэбрах

вычуваецца мяккіш і сала, дык жывёла ўжо добра выкармлена.

Як нераўнамерна выкормліваецца жывёла, аб гэтым сьведчаць прыклады з практыкі, дзе прырост на вазе быў у паадзінокіх жывёлін

за дзён	кілё
115	141
122	102
129	99
129	210
129	189
157	84
165	108.

Жывёліна лепш выкармленая мае такжа лепшую вагу. У худых жывёлін бітая вага выносіць 42 да 46 прац. жывой вагі, а ў сільна выкармленых бывае нават 66 прац. Напрыклад: калі худая карова важыць 350 кілё, дык бітая ейная вага будзе толькі 147 да 161 кілёграма (42 да 46 прац,). Затое ў сільна выкармленай цялушкі, жывая вага якой ёсьць 350 кг., бітая вага будзе 231 кг. (66 прац. жывой вагі). Бачым тут, што мяса і клустасьці значна больш, затое менш адпадкаў, чым у жывёлы худой. Дзеля таго за выкармленую скаціну на ўсіх рынках лепш плацяць, бо аж на 10 да 15 грашоў больш на 1 кілёграме жывой вагі.

Найбольш выкармленая скаціна, калі не дастане есьці, выпарожнюе трыбух і кішкі і траціць на вазе. Гэтак бывае звычайна падчас транспорту (перавозу, дастаўкі), калі скаціна ня мае адпаведнага дагляду. Яна тады можа страціць на вазе ад 8 да 10 прац і таму купцы пры куплі адлічаюць прыблізна гэту вагу, каторую скаціна траціць у часе перавозу. Гэты „абрывак“ у ялаўкі напрыклад, якая важыць 350 кг., выносіць ад 28 да 35 кг. Калі-б так здарылася, што скаціна прад зважэньнем магла напіцца больш вады, тады гэткі „абрывак“ можа быць нават за малы.

Гэтых колькі заўваг падаём нашым гаспадаром, каб добра раздумалі і калі маюць пашу, каб зараз-жа ўзяліся да выкормліваньня скаціны.

Інж. Б. В. „*Сіль. Госп.*“

Аб дробнатворах у гаспадарцы.

Ёсьць вельмі многа дробнатвораў, карысных і шкодных. Вялікая частка іх так ці гэтак зьвязана з сельскаю гаспадаркаю. Чалавек наш аднак аб нейкіх там дробнатворах чуў надта мала, а часам і нічога. А ўсё гэта ў першую чаргу дзеля таго, што ніхто ня можа дробнатвора пабачыць сваім голым вокам. Вот-жа мы тут аб гэтых дробнатворах крыху і пагутарым.

Дробнатвор найчасьцей ведамы бывае з свайго лацінскага назову: бактэрыя, або бацыл. На колькі разьмер адзіночнага дробнатвора бывае вельмі і вельмі малым, на гэтулькі здольнасьць іх да хуткага размнажаньня, а гэтым самым і лік іх бывае так вялікі, што значэньне дробнатвораў у ўсесьвеце ёсьць аграмаднае. І так:

Колькі кожнай восені ападае ўсякага лісьця, колькі штогод гіне ўсякай жывіны, колькі ў пушчах глуліх усякага паламанага парахнеючага дрэва, колькі штогод заворываецца ўсякага аржышча, гною і г д. і г. д. І куды ўсё гэта дзяецца? Бо-ж на полі ці на сенажаці кожную вясну бывае проста як замецена. Куды ўсё гэта дзелася? Адказ просты: ўсё гэта паелі дробнатворы! Але, гэтыя жывыя міліонныя і міліярдныя хмары дробнатвораў усё гэта перавялі праз свой страўны апарат і разлажылі на аснаўныя складовыя часткі. Знача, каб адзін хоць бы год так неяк сталася, што дробнатворы раптам перасталі жыць і дзеяць, дык цэлыя прасторы палёў, лясоў, лугоў сталі-б адным сплашным непраходным сьмецішчам, ці нават могілкамі, што ня можна было-б зрабіць нават аднаго кроку.

Гэтак выглядае заданьне дробнатвораў як аднаго вялікага падчышчальніка ўсіх трупоў і адпадкаў:дробнатворыператвараюць ўсё гэта ў матэрыял, з якога пасьля будуецца новае жыцьцё: расьліннае і зьвярынае. Гэткая чыннасьць дробнатвораў ёсьць для чалавека карыснай. Карыснай так-жа ёсьць чыннасьць дробнатвораў, якія ператвараюць напрыклад прэснае малако ў малако кваснае і розныя з яго вырабы. Іншыя карысныя дробнатворы працуюць напр. пры вырабе він, дрожджаў, воцту.

Апрача гэтага ёсьць дробнатворы, якіх трэба залічыць да ліку шкодных: гэта дробнатворы — насіцелі ўсякіх хвароб як людзкіх, так зьвярыных і нават расьлінных. Да шкодных так-жа дробнатвораў належаць такія, каторыя псуюць ўсякія гаспадарчыя вырабы, як масла, сала, малако, усякія збажжовыя вырабы і г. д.

Як бачым, дробнатворы, хоць самі і вельмі малыя, то аднак у жыцьці чалавека маюць аграмаднае значэньне. Розныя дробнатворы маюць розныя вымогі што да свайго ўзросту, разьвіцьця і дзейнасьці. Ад выпаўненьня ці невыпаўненьня гэтых вымаганьняў залежа памыснасьць ці непамыснасьць у жыцьці чалавека. Навука многа чаго дасьледавала ў жыцьцёвых свомасьцях дробнатвораў. Не адно з гэтага мае значэньне і ў практычнай гаспадарцы. Пазнаем гэта ў наступных нумарох «Самапомачы».

В. Ш.

ПТУШНІЦТВА

Заводныя але ня хворыя.

Калі прыходзіць месяц сакавік, кожная разумная гаспадыня павінна памятаць аб тым, што курыца з ранейшага гнязда больш карысная ад курыцы з гнязда пазьнейшага. Загранічныя гадаўцы курэй ужо даўна прынялі за правіла, што найлепшыя куры бываюць з тых гнёздаў, якія выводзяцца ў м-цы сакавіку (марцы), а таму такіх курэй у скарочаньні і называюць марцоўкамі. Зусім магчыма, што ў нашым беларускім клімаце гэты час крыху пазьнейшы і ня будзе вялікай абмылкі, калі яго агранічым месяцам сакавіком паводле старога стылю (на два тыдні пазьней).

Лішне было-б успамінаць тут, што яйкі празначаныя пад пасадку курыцы павінны быць сьвежыя (не старэйшыя як два тыдні) і паходзіць ад пэўна здаровых курэй; незалежна ад таго ці гэта куры з сваей собскай гаспадаркі, ці яйкі выменяныя ад суседа, ці ўрэшце купленыя зд лёку. Аб гэтых апошніх „заводных" яйках, купленых здалёку, трэба і сказаць тут, щто на колькі яны могуць быць карыснымі, на толькі яны і небясьпечны, бо могуць прынесьці ў гаспадарку розныя хваробы, ад каторых пасьля можа выгінуць цэлае стада. Паміж многімі іншымі хваробамі занесенымі да нас разам з заводнымі яйкамі, трэба залічыць і **белае развальненьне** ў куранят (інакш ведамае як белая діярэя або пулёроза). Дасталася гэта зараза да нас з Амэрыкі блізу 30 гадоў таму назад. Зародкі діярэі разьвіваюцца з дробнатвора *bacillus Pullorum*, які з яйцавода старой курыцы пераходзіць у яечны жаўток. Калі гэтак заражанае яйко дастанецца ў цяпло (пад курыцу, або ў інкубатар*), дык заразны бацыл вельмі хутка размнажаецца і або зразу, яшчэ ў яйку, заморывае куранё, або даводзіць яго да сьмерці ў працягу першых двух тыдняў самастойнага жыцьця. Гэткія заражаныя діярэяй куранята ў першых ўжо днях свайго жыцьця пасумнеюць, перастаюць есьці, ходзяць з апушчанымі крыльлямі, шукаюць і хаваюцца ў цёплыя куты, жмураць вочы і выкідаюць белы, быццам з крэйдай перамешаны кал. За кожным разам такога натуральнага прачышчаньня часьць клейкага калу астаецца на пушку пад хвосьцікам. З гэтага ў канцы качцоў робіцца адна сплашная непрадышная запора адходнай кішкі і куранё гіне. На 100 хворых на гэткую діярэю куранят, гіне найменш 90, а то й усе 100 штук.

Як-жа ад гэтай хваробы бараніцца?

Наўперад трэба ясна сказаць, што лячэньне гэткага кураняці ніколі не аплачваецца. Тут поўнасьцю апраўдываецца тое правіла, што лягчэй ад хваробы бараніцца, чым яе лячыць. Перш за ўсё ня можна браць на расплод яец з мясцоў, дзе зараза гэта пануе. Калі аднак зараза діярэі ўжо паявілася, дык не астаецца іншай рады, як усіх іх прадаць на зарэз ці самым рэзаць і гадоўлю пачаць нанова. У курніках мусіць быць захавана чысьціня. Купляючы яйкі на расплод, трэба мець пэўнасьць, што яны зусім здаровыя; гэта знача трэба быць пэўным, ці ў гаспадара, у каторага купляем яйкі, ня гінуць куранята ў першыя 2 тыдні па нараджэньні. На ўсякія дасьледаваньні лябораторыйныя, робленыя вэтэрынарамі, могуць сабе пазволіць толькі адумысловыя кураводныя фэрмы, бо гэткія рэчы каштуюць вельмі дорага.

Ю. З.

*) інкубатар гэта машына, у якой яйкі штучна аграваюцца і з іх праз 3 тыдні выклюваюцца куранята.

PČALARSTVA

Jak haspadaryć u pčalniku.

żmiaščajučy hety artykuł zaznačajem, što jon jość aryhinalnaj pracaj aŭtora i ni ŭ jakim razie nia jość pieradrukam ci choćby pierarobkaj artykułu hetaha-ž aŭtora drukavanaha ŭ inšym miescy. **Red.**

Pčaliny sezon nie kančajecca z pryhataŭleńniem pčalnika da zimoŭli Pravilnaja zimoŭla pčołaŭ i ŭtrymańnie ŭ całaści da viasny heta vielmi važnaja i adkaznaja reč i, možna skazać, sakret budučaha sezonu. Jakaja zimoŭla — takaja i paciecha z pčołaŭ viasnoju. Dziela hetaha pierahledzim tut važniejšyja raboty ŭ pčalniku zimoj, kab naša pčalinaja žyvina viasioła źviniela ŭ budučuju viasnu.

Ab zimoŭli pčołaŭ šmat čytajem u roznych časapisach i knižkach. Treba adnak skazać praŭdu, što ŭ hetaj spravie niama zhody: što čałaviek to rozum. I bortnik sapraŭdy nia viedaje, kamu vieryć. A byvaje i horš: hetkija rady roznych papiarovych pčalaroŭ susim supiarečnyja adny z druhimi. Naprykład: adzin rekamenduje zimoŭlu tolki ŭ zimaviku, druhi ŭ pčalniku na volnym pavietry; adzin kaža, što stol patrebnaja ŭ vulli, kab nie prapuskała ciapła, a druhi, što stol takaja zimoju na't škodnaja i h. d. My tut nia budziem krytykavać usich systemaŭ pčalarskaj haspadarki. Zaznačym tolki, što kožny taki daradčyk, u svaich miascovych varunkach pracy, moh havaryć zusim peŭnuju praŭdu. Kab ža viedać, katoraj rady kali słuchać, treba viedać sposab žyćcia pčoł i my ad hetaha pačniom.

Zimoj žyćciadziejnaść pčoł maleje, adnak nia hinie saŭsim. Pčoły dalej patrabujuć ježy, vady i ciapła da ŭtrymańnia svajho žyćcia i enerhii patrebnaj da budučaha sezonu. Najcikaviejšym źjaviščam z žyćcia pčalinaha klubka źjaŭlajecca rehulavańnie ciaplini-temperatury. U našym probnym aśklonym vulli Da-

dant-Blatta my zrabili hetkuju probu: u kłubok pčaliny my ŭstavili termometr, katory pakazvaŭ narmalnuju temperaturu 14°C. Nievialiki šorach mamentalna, pa dźvioch sekundach, padniaŭ temperaturu pčalinaha kłubka da 30°C. Pčoły pačynali hołasna šumieć, žyćciadziejnaść ich usilałasia. Dziela vyraŭnańnia ererhii pčoły pačynajuć ješči bolš miodu i, pierapaŭniajučy svoj žaludak, chvarejuć na niastraŭnaść. Zapas miodu pry hetym chutka spažyvajecca i pčoły paśla hinuć ad hoładu.

Niešta padobnaje zdarajecca i tady, kali pčołam stanie za ściudziena. Vulli robiacca z tonkich daščok. Vot-ža ŭ časie krepkaha marozu ścienki vulla nastyvajuć, para vadzianaja skraplajejecca, ściakaje na dno i zamiarzaje. Temperatura ŭ hetkim vulli raptoŭna abnižajecca. Baroniačysia ad ściužy, pčoły pavialičvajuć svaju žyćciadziejnaść, jaduć bolš miodu. U vulli-ž zavodziacca pleśni i syraść, a z hetym i ŭsie chvaroby drennaj zimoŭli (nozema). Pčoły baroniacca spačatku ad syraści tym, što źlizvajuć rasu z ścienak vulla, dna i ramak. Hetym samym pierapaŭniajuć jany svoj žaludak vadoj, katoraja dla pčały byvaje śmiarotnaj. Chvoraja pčała z pavyšanaj temperaturaj niespakojna biehaje pa vulli, paśla kidajecca ŭ lotku i tam hinie.

Ź svaje praktyki nia radžu nikomu sitkavać lotak u vulloch na zimu, bo heta asłablaje siłu pčoł, jakija i zimoju kantralujuć svabodu lotki. I kali jany ščvierdziać, što lotka zakratavana, dyk usimi siłami buduć staracca hety vylet zvolnić. U hetkim niepasilnym zmahańni hinuć časta celyja sotni pčoł, jakija svaimi trupami farmalna zatykajuć usiaki dostup pavietra ŭ vulej. Dziela hetaha radžu tolki ŭ vialikija marazy źmienšyć vylet, a kali paciapleje, dyk nieadkładna pavykidać usie zakładki i zatyčki.

Ad horačy pčoły cierpiać nia mienš, a navat bolš, jak ad ściužy. Pčaliny kłubok pašyrajecca i charakterna šumić. Miod tracić zdolnaść upivać u siabie paru i tamu pčoły adčyniajuć bolš miadovych čarak, miod u katorych ad nadbytku vohkaści (pary) psujecca, kiśnie. A heta viadzie pčalinuju siamju da zaraznaj chvaroby. — Kab uścierahčy pčoł ad hetkaje niebiaśpieki, treba pastaracca, kab jany mieli dostup volnaha pavietra. Kali hetkaje pavietra patrebnaje kožnaj žyvinie, dyk tymbolš jano patrebnaje źbitym u kłubok pčołam. Dziela hetaha nia možna i na zimu na hłucha zakryvać lotak, a paśla kožnaha śniehu treba hetyja lotki staranna, cicha (kab nie biespakoić pčoł) abčyścić, a samyja pčoły raz u dva tydni prasłuchać.

Pavodle taho jak pčoły adklikajucca, možna dahadvacca, jak jany majucca. Narmalny šum padobny da šumu dalokaj raki. Ad lohkaha ŭdaru paŭstaje zvonki šum, jaki zaraz-ža i cišeje.—Lišnie bojki šum śviedčyć, što pčołam abo za horača abo za ściudziena. Piskiivy hołas adzinokich pčołaŭ, byccam daloki płač, śviedčyć, što niama ŭžo ŭ vulli zapasno ha miodu. Cišejšy krychu „płač" śviedčyć, što ŭ vulli niama matki.

Hałodnych pčoł treba nie čakajučy padkarmić. Dziela hetaha vulli, što zimujuć nadvory i haładujuć, treba ŭnieści ŭ zacišnaje i ciaplejšaje (tolki nia ŭ chatu) pamieškańnie i padać pčołam źvierchu padkormu pryhatavanuju z samaha tolki miodu, abo z miodu i cukrovaj muki pa roŭnaj čaści, abo ŭreščie samym tolki cukram raźviedzienym vadoj na husty syrop (dźvie šklanki cukru na adnu šklanku vady). Usiakaja padkormka pavinna być ciopłaj.

Treba tak-ža bierahčy pčoły ad usialakich škodnikaŭ i vorahaŭ, jak myšy i niekatoryja ptuški (dziatły, žołny a navat vierabji), jakija načujuć pad doščačkaj nasuproć lotki i stała niepakojać pčołaŭ abo chapajuć tych, jakija advažacca pakazacca z lotki na dvor.

Biaručy pad uvahu ŭsio vyšejskazanaje prychodzim da nastupnaha vysnaŭku:

1) pčoły sami padtrymlivajuć uzimku narmalnuju ciapliniu. Kali mima taho adnak z niezaležnych ad pčoł pryčyn heta ciaplinia padyjmiecca vyšej abo apuścicca nižej aznačanaj ciaplini, dyk pčoły ad hetaha źjadajuć bolš miodu i paśla chvarejuć na niastraŭnaść, paśla haładujuć i navat hinuć.

2) Pry pavyšanaj ciaplini ŭ vulli pčoły cierpiać ad prahi, źjadajuć bolš miodu i ad hetaha chvarejuć. Pry ciaplini nižejšaj ad narmalnaj u vulli zavodzicca syraść, pleśni, miod kiśnie i pčoły tak-ža chvarejuć.

3) Śviežaje i čystaje pavietra pčale jošč kanieśnym i tamu treba dbać, kab u vulli była ventylacyja.

4) Najbolšaj niebiaśpiekaj dla zimujučych pčoł jošč niastača zapasu miodu. Tamu hałodnych pčoł treba čymchutčej padkarmlivać

5) Myšy i pieraličanyja vyšej ptuški źjaŭlajucca vorahami pčoł choć-by ŭžo dziela taho, što niepakojać ich padčas zimovaha supačynku. Kožnaje-ž takoje niepakojeńnie mianiaje ciapliniu ŭ vulli, ad čaho pčoły źjadajuć bolš miodu i paśla haładujuć, chvarejuć i navat hinuć.

V. Papucevič.

Małaja Alšanka, 6.I.36.

Chto choča stała, biez pieraryvu, atrymoŭvać „Śamapomač", toj musić zaraz-ža vysłać svaju składku.

Redaktar inž. A. KLIMOVIČ Vydaviec A. DASIUKIEVIČ
Z upavažnieńnia Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Vilni.
Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1 — 2.

U čas ablotu pčoł.

Ablot pčoł heta dobry čas padhledzić, jak kožny pień pierazimavaŭ i čaho katoramu z ich treba. A dziela hetaha padčas ablotu pčalar kaniešna musić być na pasiecy, mieć z saboj ałavik, kusok papiery i ŭsio zapisvać. Ablot kožnaha pnia tryvaje 10—20 minut. Tyja pni, što dobra ablatajucca, dahladu nie patrabujuć. Uvaha pčalara pavinna być źvierniena na pni, jakija ablatajuć kiepska: hetkija pni treba zaznačyć. Kali pień zusim nie ablotaŭsia, dyk treba zahlanuć u jaho zaraz-ža pa skončanym ablocie. Kali akažycca, što pčoły admiorli, dyk z siaredniaj ramki treba ŭziać aściarožna źmieniu osypu, zanieści ŭ chatu i abahreć: ni-daŭna admioršyja pčoły pry hetym ažyvajuć i tady treba prystupać da ratavańnia cełaha pnia. Kali-ž probnaja žmienia pčoł nie adžyvie i paśla abahravańnia, dyk heta znača, što pčoły prapali i ratunku dla ich užo niama. Ratunak-ža vyhladaje hetak: vulej unosicca ŭ chatu, ahravajecca, skroplivajecca sytaj, pakul nie ačuniaje.


Kali pčoły, zamiest lacieć na ablot, łaziać tolki pavoli pa lotcy, nie latuć i čas ad času vypuskajuć kał, dyk heta znača, što takija pčoły zachvareli na niastraŭnaść abo na nozemu. U hetkim pni treba źmianić zabrudžanyja, ramki na čystyja, źmienšyć hniazdo, ciopła ŭkryć, a na viečar dać redkaj syty (2 častki vady na 1 častku cukru) z dadatkam salicyłavaha kvasu.

Viaśniany korm pčoł.

Viasnoj pčoły hadujuć svoj čer i tamu patrabujuć kormu bahataha na białki: miod, śviežaje karoviaje małako, jaječny białok,— heta tady, kali na dvary niama jšče ćvietavaha pyłku. Sposab padavańnia pčołam miodu viedamy i ab hetym tut havaryć nia budziem. Małako dajecca z sytaj (syropam) u takim vyrachavańni, što na 2 mierki syty dajecca 1 mierka małaka. Davać treba takuju porcyju, kab jaje pčoły za raz źjadali dy kab małako **nia śkisła.** Małako dobrym byvaje asabliva dla tych vulloŭ, što praz zimu žyvilisia samym tolki cukram.

Jaječny białok dajecca pčołam taksama sałodžany: z syroha białka žbivajecca piena, miašajecca z cukorvym pyłam tak, kab na adnu mierku białka byli dźvie mierki cukru. Atrymoŭvajecca hustavataja kaša, jakoj i karmiacca pčoły.

Š—ek.



(Dalejšy ciah cenaŭ z 2-hoj bačyny vokładki).

Miasnoje, za 1 kilo žyvoj vahi.

Bydła:

	stadniki (buhaj) . . .	0.35—0.45
	karowy	0.35—0.50
	cialaty	0.60—0.65
Švini		0.55—0.70

Za 1 kilo bitaj vahi.

Vałovina, celyja štuki, ...	0.75—0.85
,, zady	0.90—1.00
Vałovina, pierady (košer)	0.90—100
Cialacina, ...	0.60—0.70
Švinina	0.90—1.00

Skury syryja.

Skury bydlačyja, za kilo	0 80
Skury cialačyja, za štuku	5.00—6.00
Ščacina (šerść švinskaja) . . .	8.00—10.00

Ceny na pravincyi

(Za 100 kilo).

U Navahradku:

Žyta	10.20—10.30
Avios	10.50—11.60
Jačmień	10 50 - 10.75
Vika jaravaja	14.00—16 00
Pialuška	16.00 - 19 50
Haroch šery	12 00—13.00
Siemia lnnoje	29.00—31.00

Miasnoje, za kilo.

U Navahradku:

Svini słaninavyja, I sort vahi nad 160 kilo, za kilo . . .	0.76
Vahi pad 160 kilo ,, . . .	0.56- 0.70

U Baranavičach:

Buhai	0.40—0.42
Karovy i jałaŭki	0.40—0.43
Skacina niavykarmlenaja	0 28—0 32
Cialaty	0.40—0 43
Švini słaninovyja	0.73—0.78
,, mienšyja	0.67—0.72
Vałovina	0.54—0.61
Cialacina	0 50 - 0.60

Pierasyłka apłačanu ryčałtam.

